# Візуалізацыя інфармацыі для вучняў з АПФР

**Т. В. Шаўлюк,**
настаўнік-дэфектолаг (настаўнік-лагапед)
вышэйшай катэгорыі
Ракаўскай СШ Валожынскага раёна

Адным з прынцыпаў дыдактыкі з'яўляецца "прынцып нагляднасці" – "залатое правіла", згодна з якім неабходна прымяняць сродкі нагляднасці і абапірацца на зрокавы аналізатар пры ўспрыманні вучэбнай інфармацыі для эффектыўнасці навучання дзяцей. "Лепш адзін раз убачыць, чым сто разоў пачуць", – кажа народная мудрасць. Гэта пацвярджаюць і работы класікаў дыдактыкі (Я.А.Каменскага, Ж.Ж.Руссо, І.Г.Песталоцы, К.Д.Ушынскага і інш.), якія не раз надавалі значную ўвагу прынцыпу нагляднасці як інструменту для пазнання свету і развіцця мыслення навучэнцаў [1].

Вучні з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця (далей АПФР) лепей засвойваюць матэрыял, які успрымаецца праз розныя сенсорныя каналы (слухавы, зрокавы, рухальны), у тым ліку зрокавы аналізатар. Дапамагае рашыць гэту задачу выкарыстанне ў працы настаўніка-дэфектолага розных метадаў і прыёмаў, у тым ліку сродкаў візуалізацыі.

Тэрмін **"візуалізацыя"** ў перакладзе з лацінскага "visualis" – прадстаўленне фізічнай з'явы ці працэсу ў форме, зручнай для зрокавага ўспрымання, іншымі словамі – успрымаемы зрокава, нагляндны [3]. У шырокім сэнсе слова візуалізацыя – гэта працэс прадстаўлення дадзеных у выглядзе малюнка з мэтай максімальнага іх разумення, а кагнітыўная візуалізацыя накіравана не толькі на дэманстрацыю нагляднага матэрыялу, але і на яго перапрацоўку, развіццё пазнавальных магчымасцей дзяцей і іх лагічнага мыслення.

Выкарыстанне на ўроках разнастайных сродкаў і прыёмаў кагнітыўнай візуалізацыі робіць урок больш інфарматыўным і эффектыўным. Візуалізацыя выконвае ілюстратыўную функцыю і спрыяе паспяховаму працэсу атрымання новых ведаў.

Сродкі візуалізацыі накіраваны на тое, каб абудзіць у вучняў з АПФР пазнавальную актыўнасць, задзейнічаць тыя веды, што ўжо ёсць, і стварыць умовы для асэнсавання новага матэрыялу. Гэта дазваляе адысці ад пасіўнага слухання да актыўнай формы работы, што прыводзіць да павышэння эфектыўнасці ўрокаў.

Сродкі візуалізацыі можна выкарыстоўваць**:**

- для фармулявання тэмы і мэты ўрока;
- для тлумачэння і замацавання новай тэмы;
- для праверкі пройдзенага матэрыялу;
- для сістэматызацыі і абагульнення вывучанага і інш.

Існуе вялікая колькасць традыцыйных спосабаў візуалізацыі на ўроках: апорныя канспекты, схемы, табліцы, малюнкі, мадэлі, планы, прэзентацыі, відэаролікі, фрагменты відэаматэрыялаў і іншыя.

Аднак трэба адначыць, што ў наш час, час развіцця камп’ютарных тэхналогій, з’яўляюцца і новыя сродкі візуалізацыі – інфаграфіка, інтэлект-карты, воблака слоў, лента часу, кросэнс, скрайбінг, інтэрактыўныя прэзентацыі і інш [2].

Задача візуалізацыі – прадставіць і структурыраваць осноўны матэрыял, забяспечыць лагічнасць пры падачы матэрыялу, а таксама паказаць дзецям сувязь паміж малюнкам, графічнай выявай і вучэбным матэрыялам, тым самым садзейнічаць развіццю лагічнага мыслення ў вучняў.

Разгледзем некаторыя з іх:

**“Воблака слоў”** – гэта форма візуалізацыі дадзеных, якая ўяўляе сабой набор ключавых слоў і словазлучэнняў, напісаных розным памерам, шрыфтам і нават колерам.

**Кросэнс** – асацыятыўная галаваломка новага пакалення. Слова "кросэнс" азначае "скрыжаванне сэнсаў" і прыдумана па аналогіі са словам "крыжаванка", якое ў перакладзе з англійскай мовы азначае "скрыжаванне слоў".

**Кластар** (скапленне, гронка, пучок) – гэта графічная форма арганізацыі інфармацыі, калі вылучаюцца асноўныя сэнсавыя адзінкі, якія фіксуюцца ў выглядзе схемы з пазначэннем усіх сувязяў паміж імі.

**Таймлайн** (ад англ. timeline – «лінія часу») – гэта шкала часу, якая прадстаўлена прамым адрэзкам, на якім у храналагічным парадку адзначаюцца падзеі, якія адбыліся.

**Інтэлект-карта** – гэта графічны спосаб прадстаўлення ідэй, розных канцэпцый і інфармацыі ў выглядзе карты ці табліцы, якія складаюцца з асноўных і дадатковых тэм.

У рабоце з дзецьмі з АПФР мы можам выкарыстоўваць амаль усе сродкі візуалізацыі як на пісьмовых, так і вусных уроках у пачатковых класах і ў сярэдняй школе. Можна карыстацца традыцыйнымі формамі метадаў, а можна іх і відазмяняць, арыентуючыся на індывідуальныя асаблівасці дзяцей з АПФР і ўзровень іх адукацыі.

Прапаноўваю вашай увазе канспект ўроку па навучанню грамаце (чытанне) у 1 класе інтэграванага навучання і выхавання па праграме спецыяльнай адукацыі для дзяцей з цяжкімі парушэннямі маўлення з выкарыстаннем некаторых прыёмаў візуалізацыі.

| | *I клас сярэдняй школы* | *I клас спецыяльнай школы для вучняў з цяжкімі парушэннямі маўлення* |
|---|---|---|
| **Тэма** | абазначэнне мяккасці зычных гукаў літарай ***Я*** [4] | дыферэнцыяцыя літар ***і*** - ***ы*** |
| **Мэта** | фарміраванне ўяўленняў пра роль літары ***Я*** як паказчыка мяккасці зычных гукаў | фарміраванне ўменне адрозніваць літары ***і*** – ***ы*** |

| | | |
|---|---|---|
| **Задачы** | - сфарміраваць прадстаўленне пра неабходнасць выкарыстання літары ***Я*** для абазначэння гука [а] пасля мяккіх зычных гукаў;<br>- працягваць фарміраваць уменне чытаць склады, словы і сказы з літарай ***Я;***<br>- працягваць фарміраваць уменне дыферынцыраваць мяккія і цвёрдыя гукі на слых;<br>- садзейнічаць развіццю слухавой увагі;<br>- выхоўваць арганізаванасць, самакантроль і ўменне ацэньваць сябе, вынікі асабістай дзейнасці | - працягваць фарміраваць уменне чытаць адкрытыя і закрытыя склады, двухскладовыя словы з вывучаемымі літарамі;<br>- працягваць фарміраваць уменне дыферынцыраваць мяккія і цвёрдыя гукі на слых;<br>- садзейнічаць развіццю слухавой увагі, зрокавага ўспрымання і ўважлівасці;<br>- выхоўваць арганізаванасць, самакантроль і ўменне ацэньваць сябе, вынікі асабістай дзейнасці |
| **Абсталяванне** | «Буквар», с. 86-87; малюнкі мядзведзя, лесуна; гукавая схема слоў “ласун, лясун”; карткі (“Воблака літар”) і інш. | “Буквар”, с. 37-38; індывідуальныя карткі (кросэнс, “Графічны вобраз”, “Воблака літар”), просты аловак, ручка і інш. |
| **ХОД УРОКА** | | |
| I. УСТУПНАЯ ЧАСТКА | | |
| **Арганізацыйны этап**<br>Стварэнне станоўчай матывацыі для засваення новых ведаў | -Хто сёння прыйшоў у школу з добрым настроем? **-<u>Памахайце мне рукой.</u>**<br>-Хто ведае, што ў нас зараз урок чытання? **-<u>Плясніце ў далоні.</u>**<br>-Вельмі рада Вас усіх бачыць! Спадзяюся, што Вы таксама!<br>-Каб нам было весела, да нас у госці на ўрок прыйшло шмат гасцей! -Адзін з гэтых гасцей, вось нават спаць не пайшоў, не лёг у зімнюю спячку!!! -Гэта мядзведзь!!! (*настаўнік вывешвае малюнак* | |

<table>
<tr><td></td><td colspan="2">мядзведзя)</td></tr>
<tr><td>II. АСНОЎНАЯ ЧАСТКА</td><td colspan="2"></td></tr>
<tr><td rowspan="2">Паведамленне тэмы ўрока</td><td colspan="2">Заплюшчваем вочкі, каб стала цікавей! - Толькі абяцайце не падглядваць! (у гэты час настаўнік адкрывае раней падрыхтаваныя літары на дошцы (малюнкі)):</td></tr>
<tr><td>-Глядзім, якую літару мы паўтараем з усім класам???<br>– Каму цікава даведацца пра новыя са-крэты літары Я? Да-краніцеся пальцам да кончыка носа.</td><td>- А з Вікторыяй, паглядзі, калі ласка, мы яшчэ паўторым літары і- ы. (з правага боку)</td></tr>
<tr><td>Праца па тэме</td><td colspan="2">- Практыкаванне “Мяккія - цвёрдыя” (на дошцы намаляваныя кругі пэўнага колеру)<br>-Перш чым мы пачнём выконваць цікавыя заданні, трэба праверыць вашу ўважлівасць! -Ці ўважліва Вы ўсе слухаеце?<br>-Ці ўсё будзеце чуць? Мядзведзь не проста так прыйшоў!<br>-Я называю словы, калі чуеце першы гук [с]/[л] мяккі – паднімаеце левую руку, а калі цверды гук – правую. Глядзіце падказку на дошцы! (на дошцы арыенціры (сіні круг/зялёны круг))</td></tr>
</table>

| | | |
|---|---|---|
| | **-Гукавы аналіз слоў. Абазначэнне гукаў літарамі.** Настаўнік працягвае гутарку:<br>-Настаўнік прымацоўвае на дошку малюнак мядзведзя і гукавую схему. Вучні пад кіраўніцтвам настаўніка разглядаюць гукавую мадэль слова “ласун”:<br>- А цяпер заплюшчваем вочкі (настаўнік вывешвае другі малюнак, другога госця – *лесуна* і другую схему)<br>***Увядзенне новага спосабу дзеяння.*** Настаўнік паведамляе:<br>– Гук [а] пасля мяккага зычнага гука абазначаюць літарай ***Я***.<br>-Настаўнік уводзіць спосаб чытання:<br>– Каб прачытаць склад з літарай ***Я*** трэба вымавіць разам, без прыпынку мяккі зычны гук і галосны гук [а]. | **Практыкаванне “Графічны вобраз”**<br>-Пакуль мы з дзецьмі вельмі падрабязна знаёмімся з літарай ***Я***, ты, Міла, у гэты час, калі ласка, выканай такое невялікае заданне.<br>-Раздзялі гэтыя словы на дзве часткі, адны да літары **ы** (у словах, дзе ёсць дадзеная літара), другія, там дзе ёсць літара **і.** (*настаўнік дае лісток з заданнем для замацавання графічнага вобраза*):<br><br><br>**Практыкаванне “Знайдзі літары”**<br>(*на выпадак калі Віка справілася з мінулым заданнем вельмі хутка*)<br>-Малайчына, ты справілася з мінулым заданнем вельмі хутка, а цяпер, калі ласка, вось у гэтым маленькім тэксце знайдзі і абвядзі ў кружок літары **і, ы** (заданне на індывідуальнай картцы) |
| **Зрокавая гімнастыка** | *на аснове графічных арыенціраў* | |
| **Замацаванне атрыманых ведаў** | | |
| **Чытанне моўнага матэрыялу** | ***Чытанне складоў і слоў з літарай Я*** | ***Чытанне складоў і слоў з літарамі І, і - ы*** |
| | Чытанне складоў і слоў арганізуецца для ўсяго класса згодна | |

| | | |
|---|---|---|
| | старонак буквара (згодна з праграмай) | |
| | Работа арганізуецца з вучэбным матэрыялам с. 86 буквара.<br>***Чытанне складоў з літарамі А і Я.***<br>***Чытанне слоў з літарамі А і Я*** (дзеці па чарзе чытаюць свой матэрыял, у тым ліку Міла) | Работа арганізуецца з вучэбным матэрыялам с. 37 буквара.<br>***Чытанне складоў з літарамі І,ы.***<br>***Чытанне слоў з літарамі І, ы (***на с.37) |
| **Фізкультхвілінка** | | |
| | ***Адпрацоўка навыку чытання слоў і сказаў.*** Вучні чытаюць слупкі слоў: самастойна напаўголаса; услых. Настаўнік арганізуе выбарачнае чытанне слоў услых па заданнях:<br>– Прачытайце словы першага і другога слупкоў, якія складаюцца з трох складоў. *(Мамуля, мамуся; татуля, татуся.)* Утварыце падобныя словы ад слоў “баба”, “дзед”. *(Бабуля, бабуся; дзядуля, дзядуся.)*<br>– Прачытайце словы трэцяга слупка, у якіх двойчы паўтараецца адзін і той жа склад.<br>– Знайдзіце і прачытайце імёны, у якіх схавалася яшчэ адно імя | **Практыкаванне “Скрайбінг надрукаваны”**<br>-Табе, Міла, патрэбна размеркаваць малюнкі, у назвах якіх ёсць гукі [і, ы] да літар і, ы. У назве слоў, дзе ёсць гук **і** – мы стрэлкамі вядзём да літары **і**, а там, дзе ёсць гук **ы** – да літары **ы**!<br><br><br>**Практыкаванне “Кросэнс”**<br>- А цяпер вось давай будзем чытаць невялікія словы па парадку, пачынаючы з верхняга |

| | | |
|---|---|---|
| | *(Галя – Аля, Поля – Оля, Толя – Оля, Коля – Оля.)* | левага вугла і адкрываць акенцы, ці правільна мы прачыталі слова (*настаўнік аказвае дапамогу*)<br><br> |
| **Чытанне сказаў і тэкстаў з вывучанымі літарамі** | | |
| | ***Падрыхтоўка да чытання сказаў і тэксту.*** Вучні чытаюць слупкі слоў на с. 87 буквара.<br>***Чытанне сказаў. Чытанне тэксту.*** Настаўнік арганізуе работу з тэкстам (с. 87 буквара) | **Складанне слоў са складоў і чытанне** (*склады markedly*)<br>**Чытанне слоў з вывучанымі літарамі** (*картка, калі застанецца свабодны час*) |
| III. ЗАКЛЮЧНАЯ ЧАСТКА | | |
| **Падвядзенне вынікаў урока**<br><br><br><br><br><br><br>**Рэфлексійны аналіз дзейнасці вучняў** | **Практыкаванне “Воблака літар”**<br>-Мы з Вамі правялі цікавы ўрок!<br>-Каб замацаваць, з якімі літарамі мы працавалі, раздаю Вам лісточкі, у якіх Вы павінны знайсці і абвясці ў кружочак літару, з якой працавалі на ўроку!! Увесь клас з літарай **Я**, а Міла з літарамі **І, Ы** (*усяго 5 літар*)<br><br>У выніку рэфлексіі сваіх дзеянняў на ўроку вучні павінны ўсвядоміць, пра што яны даведаліся, чаму навучыліся. | |

## Літаратура

1. **Гусейнов А. З.** Развитие принципа наглядности в истории педагогики [Электронный ресурс]. – Режим доступа: Downloads/razvitie-printsipa-naglyadnosti-v-istorii-pedagogiki.pdf. – Дата доступа: 01.06.2023.
2. **Средства визуализации информации** [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://e-asveta.adu.by/index.php/distancionni-vseobuch/obuchenie-online/sredstva-vizualizatsii-informatsii. – Дата доступа : 01.06.2023.
3. **Вишнякова С. М.** Профессиональное образование: Словарь. Ключевые понятия, термины, актуальная лексика [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://didacts.ru/slovari/professionalnoe-obrazovanie-slovar-klyuchevye-ponjatija-terminy-aktualnaja-leksika.html. – Дата доступа : 01.06.2023.
4. **Свірыдзенка, В. І.** Навучанне чытанню ў 1 класе, у 2 ч. : вучэбна-метадычны дапаможнік для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання / В. І. Свірыдзенка, В. І. Цірынава. – Мінск : НІА, 2021.